# Як гартавалася сталь

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у цырымоніі закрыцця турніру па хакеі «Алімпійскія надзеі», на якім перамогу атрымалі сталічныя «Грыфоны».**

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў спартсменаў, падзякаваў трэнерам і бацькам за падрыхтоўку, а таксама параіў не засмучацца гульцам камандаў «Алімп», «Мядзведзь» і «Міраж», якія занялі другое, трэцяе і чацвёртае месцы адпаведна, «бо паражэнні загартоўваюць характар».

— Гледзячы на вас усіх, падумаў, што, напэўна, будзем хутка змагацца ў фінале чэмпіянату свету. Бо пасля завяршэння выступлення за нацыянальную зборную Антоненкі, Мезіна, Стася, Міхалёва — прорва. Вы — наша надзея і не толькі алімпійская, — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на гульню дружын з Брэсцкай і Магілёўскай абласцей («Алімп» і «Міраж»). Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэтыя каманды годна змагаліся са сталічнымі сапернікамі. У завяршэнне ён пажадаў усім удзельнікам турніру шчасця, поспехаў і новых перамог.

**Паводле БЕЛТА.**

■ Парламенцкі дзённік

# На дарогі пусцяць прыватніка

**Учора ў Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу адбылося адкрыццё сесій. На іх парламентарыі разгледзелі больш за дзясятак пытанняў эканамічнага, сацыяльнага і міжнароднага плана.**

Сярод дзевяці законапраектаў, якія прынялі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні, былі і змены ў закон «Аб аўтамабільных дарогах і дарожнай дзейнасці». Па словах **Дзмітрыя ЗАБЛОЦКАГА, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі**, цяпер у законе асобна прапісаны варыянт дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Ёсць шэраг інфраструктурных праектаў, якія варта выканаць. Але на іх у бюджэце няма сродкаў. Цяпер яны будуць выносіцца на конкурс у тым ліку і для прыватных інвестараў. Але ж такі ўкладчык чакае прыбытку. «Яго можа забяспечыць увядзенне платы за праезд па такіх адрамантаваных дарогах. Але гэта датычыцца толькі транзітных транспартных сродкаў. Для грамадзян Беларусі праезд застанецца бясплатны. І мы, дэпутаты, будзем і надалей адстойваць такую пазіцыю. Аднак магчыма, што з'явіцца альтэрнатыва: праязджаць па дарозе без платы ці з ёй, але па больш якасным шляху, тады ўжо гэта аплата будзе датычыцца ўсіх без выключэння. Але абавязкова павінна быць альтэрнатыва», — падкрэсліў дэпутат.

Адказваючы на пытанні парламентарыяў па законапраекце, **міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК** паведаміў, што зараз у Беларусі каля 1,5 тысячы платных дарог і плануецца далейшае павелічэнне іх колькасці. Напрыклад, шостая дарога (М6/Е28 Мінск — Гродна — граніца Польшчы (Брузгі), якая сёння знаходзіцца на рэканструкцыі, будзе платнай. Міністр нагадаў, што ў папярэднія гады была прынята норма — дарогі, якія рэканструююцца, становяцца платнымі, за выключэннем другой кальцавой дарогі.

У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі было разгледжана восем пытанняў. На пачатку пасяджэння члены верхняй палаты парламента далі згоду на назначэнне Прэзідэнтам нашай краіны старшыні Канстытуцыйнага суда Беларусі Пятра Міклашэвіча, а таксама суддзяў Вярхоўнага суда Юрыя Кобеца, Ігара Калесніка, Тацяны Міколенкі, Канстанціна Харытанюка. Сенатары таксама станоўча разгледзелі пытанне аб абранні членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Генадзя Давыдзькі.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** сам выступіў дакладчыкам па двух пытаннях, разгледжаных на адкрыцці сесіі. Першае — аб задачах Савета Рэспублікі па ўдасканаленні сацыяльна-эканамічнага развіцця і дзяржаўнага будаўніцтва на сучасным этапе. У прыватнасці, спікер звярнуў увагу на неабходнасць больш актыўнай работы з урадам па ўдасканаленні ўмоў інвестыцыйнай дзейнасці. «Адной з найбольш запатрабаваных заканадаўчых мер з'яўляецца кансалідацыя нарматыўна-прававых актаў па дадзеных пытаннях у адзіны комплексны дакумент, магчыма, гэта Закон Рэспублікі Беларусь «Аб інвестыцыях», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Нарэшце сістэмнага падыходу старшыня Савета Рэспублікі прывёў прыклад, што для рэалізацыі нормаў толькі Дэкрэта № 7 неабходна карэкціроўка 6 кодэксаў, 21 закона, 13 указаў Прэзідэнта і 34 пастаноў Савета Міністраў. Другое пытанне — аб правядзенні сумеснага пасяджэння абедзвюх палат парламента для заслухоўвання штогадовага Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Беларусі. Правесці яго плануецца ў красавіку.

**Вераніка ПУСТАВІТ, Надзея АНІСОВІЧ** ■

■ Прэс-канферэнцыя

# НА КАРЫСЦЬ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

## У Гродзенскай вобласці рамантуюць палацы і дарогі, а таксама рыхтуюцца да фестывалю нацыянальных культур

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ расказаў падчас прэс-канферэнцыі ў Шчучыне аб надзённых і перспектыўных праектах рэгіёна.**



### Падтрымаюць інвестараў

Так супала, што Год малой Радзімы адметны яшчэ і юбілейнымі датамі многіх населеных пунктаў, у тым ліку і Гродна. Напрыклад, абласному цэнтру сёлета споўніцца 890 гадоў, Астраўцу — 650, Дзятлаву — 520, Зэльве — 760, Смаргоні — 515 гадоў. Будуць адзначацца і юбілеі вядомых людзей.

— Гэта добрая магчымасць, каб мабілізаваць усе здольнасці, дадаць прыгажосці і ўтульнасці Гродзеншчыне падчас Года малой Радзімы, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

У першую чаргу варта звярнуць увагу на гістарычныя і архітэктурныя помнікі. Многія з іх патрабуюць рэканструкцыі. У мінулым годзе пачаліся работы на такіх знакавых для рэгіёна аб'ектах, як Стары Замак і Каложская царква ў Гродне, Крэўскі, Гальшанскі, Навагрудскі і Лідскі замкі. Сродкі на рэканструкцыю выдзяляе дзяржава, абласны бюджэт. Але знаходзяцца і асобныя інвестары. Прыклад таму — рэканструкцыя палаца роду Умястоўскіх у Іўеўскім раёне. Доўгі час гэты прыгожы будынак стаяў пусты і прыходзіў у заняпад. Замежны інвестар не пранікся ідэяй узнаўлення, і ўлады вымушаны былі перадаць палац ва ўласнасць дзяржавы. Але знайшоўся беларус, які за ўласныя сродкі заняўся яго рэканструкцыяй, і зараз там ідуць работы. Такіх людзей улады заўсёды гатовы падтрымаць, — адзначыў Уладзімір Краўцоў.

### Прыярытэт мясцовым дарогам

Дарогі для прыгранічнага рэгіёна — яго візітная картка. Дарэчы, ім у сельскай мясцовасці будзе ўдзелена асаблівая ўвага. У гэтым годзе на іх рамонт выдаткавана 50 млн рублёў. Такая значная сума складаецца з бюджэтных сродкаў, часткі транспартнага падатку, ільготнага крэдыту банка. Плануецца адрамантаваць 250 км сельскіх дарог.

Уладзімір Краўцоў паведаміў і аб новых «дарожных» праектах па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Беларусь — Украіна». Іх чатыры: два ўчасткі дарогі вядуць да мяжы з Літвой, два да палацава-паркавага комплексу «Свяцк».

Вядома ж, не застануцца без увагі і магістралі. На іх рамонт і ўтрыманне прадугледжана значнае фінансаванне — 35 млн рублёў. Інвестпраграма разлічана на тры гады. Адзін з будучых праектаў — будаўніцтва пуцепровода праз чыгунку каля горада Скідзеля. У хуткім часе плануецца працягваць работу па капітальным рамонце ўчастка трасы М-6 Мінск — Гродна — граніца Рэспублікі Польшча. Пяцікіламетровы ўчастак таксама знаходзіцца ў раёне Скідзеля.

### Фестываль пад дэвізам «бязвізу»

Чарговы XII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур пройдзе на пачатку чэрвеня, і ўпершыню на ім змогуць пабываць бязвізавыя турысты.

Галоўнае відовішча — яркае вясёлае шэсце нацыянальных суполак з удзелам цыркачоў, скамарохаў, «сярэднявечных» рыцараў. Цэнтральная плошча будзе ўяўляць беларускі падворак, які стане самым маштабным. Падворкі нацыянальных суполак размесцяцца ў дворыках гістарычнага цэнтра горада.

З новых «фішак» — рэтра-кафэ «на калёсах», механічная дыярама, кірмаш, карнавал аніматараў і шмат чаго іншага. Завершыць другі дзень свята этна-вечарына.

А вось на трэці дзень, у нядзелю, фестываль перамесціцца на Аўгустоўскі канал. Тут гасцей чакаюць гульні, выступленні музычных калектываў, фестываль танца і эка-фестываль.

Плануецца, што на свята прыедзе каля 800 удзельнікаў — прадстаўнікоў нацыянальных суполак з усяе Беларусі. Упершыню будуць прадстаўлены арабы, балгары, кітайцы, латышы, мардвіны і нават індыйскія тамілы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ** ■

■ Грошы

# Падаткі за здачу ў наём растуць

**У Мінску на 6,3 % павялічыліся стаўкі падаходнага падатку ў фіксаваных сумах з фізічных асоб, якія атрымліваюць прыбытак ад здачы ў арэнду жылых, нежылых памяшканняў і машына-месцаў. Адпаведнае рашэнне прынята на другой сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання.**

Намеснік начальніка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Мінску Вольга Кішко растлумачыла, што карэкціроўка ставак абумоўлена неабходнасцю іх адаптацыі да інфляцыйных працэсаў. Новы памер ставак падаходнага падатку за здачу жылых памяшканняў (за пакой, які здаецца) у першай эканоміка-планіровачнай зоне сталіцы склаў 32,5 рубля (павышэнне на 2 рублі), у другой — 27 рублёў, у трэцяй і чацвёртай — 23 рублі (павышэнне на 1,5 рубля), у пятай — 18,5 рубля (на 1 рубель).

Новыя стаўкі падаходнага падатку за здачу ў арэнду нежылых памяшканняў (за выключэннем гаражоў, машына-месцаў) за 1 квадратны метр плошчы ў першай і другой эканоміка-планіровачных зонах цяпер складаюць 5,3 рубля, у трэцяй — 3,5 рубля, у чацвёртай і пятай — 3 рублі. Стаўкі змяніліся і для тых, хто здае ў арэнду металічныя, драўляныя гаражы і машына-месцы. Яны сталі вышэй за папярэднія на 0,4—0,5 рубля. Для арэндадаўцаў жалезабетонных або цагляных гаражоў — на 0,7—0,8 рубля.

Вольга Кішко паведаміла, што па стане на 1 студзеня 2018 года ў Мінску зарэгістравана больш за 61 тысячу фізічных асоб, якія аплачваюць падаходны падатак у фіксаваных сумах. Іх плацяжы ў бюджэт летась перавысілі 14 млн рублёў. Чакаецца, што прыбыткі бюджэту сталіцы ў сувязі са зменай памераў ставак сёлета павялічацца больш чым на 891 тыс. рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

■ Навуковае супрацоўніцтва

# Геапалітычныя скрыжаванні Беларусі

## У Інстытуце гісторыі НАН прайшла міжнародная канферэнцыя па знешняй палітыцы

**Інтэграцыя ў ЕАЭС, міжнародная энергетычная бяспека, патэнцыял супрацоўніцтва Беларусі з ЗША і Еўропай — гэтыя і іншыя пытанні ў фокусе ўвагі форуму «Беларусь у сучасных геапалітычных і геаэканамічных працэсах».**

Акрамя вучоных у канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі органаў кіравання і дыпламатычнага корпуса. У Мінск прыехалі эксперты ў міжнародных адносінах з 10 краін.

— Правядзенне такіх навуковых мерапрыемстваў асабліва неабходна цяпер, калі Еўропа сутыкаецца з такім выклікамі, як міграцыйны крызіс, раскансалідацыя грамадства і новыя пагрозы бяспекі. Адзіны шлях эфектыўнага супрацьстаяння гэтым выклікам — узгодненыя дзеянні, дыялог і супрацоўніцтва паміж усімі еўрапейскімі краінамі, — падкрэсліў актуальнасць сустрэчы **Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі.**

Асаблівая роля ў гэтым плане надаецца Беларусі. У тым ліку, дзякуючы яе геапалітычнаму становішчу.

— Геапалітычнае становішча Беларусі характарызуецца тым, што яна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, на стыку цывілізацый, інтарэсаў вялікіх дзяржаў, пад уплывам эканамічных і ваенна-стратэгічных фактараў. Разам з тым геаграфічнае становішча нашай краіны на перасячэнні транспартных камунікацый дапамагае выгадна яго выкарыстоўваць для стымулявання эканамічнага развіцця, узмацнення сваіх пазіцый у рэгіянальнай палітыцы. Аб'ектыўна Беларусь сёння выконвае ролю моста паміж захадам і ўсходам, поўначчу і поўднем, — падкрэсліў **Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі.**

Акрамя таго, геаграфічнае становішча абумовіла і складаны гістарычны шлях Беларусі. Краіна, якая знаходзіцца на геапалітычным скрыжаванні, была арэнай крывавых войнаў і сферай інтарэсаў розных дзяржаў. Але, нягледзячы на гэта, Беларусь адстаяла свае правы на незалежнасць і самастойнасць.

Арганізаваў і размясціў на сваёй пляцоўцы канферэнцыю Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Падтрымала ініцыятыву Прадстаўніцтва па Беларусі Фонду імя Конрада Адэнаўэра (Германія). Арганізацыя праводзіць адукацыйныя семінары, кансультацыі, каб пабудаваць масты і ўзмацніць сувязі Беларусі з Германіяй і іншымі краінамі Еўрасаюза.

**Марыя ДАДАЛКА** ■